355.331 : 92
П 27

С. ПЕРСАЎ

★

# ГЕРОЙ САВЕЦКАГА САЮЗА

# ГАЎРЫІЛ ПАЛАЎЧЭНЯ



ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

1073

355,331 : 92
П 27

С. ПЕРСАУ

★

ГЕРОЙ
СОВЕЦКАГА САЮЗА

# ГАЎРЫІЛ ПАЛАЎЧЭНЯ

57328

Бібліятэка БССР

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

355,331 : 92
П 27

С. ПЕРСАУ

★

Герой
Совецкага Саюза

# ГАЎРЫІЛ ПАЛАЎЧЭНЯ

57328

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

Инв.
1954 г.



## I

Ціхая, марозная маскоўская ноч. Не чуваць ні рокату знішчальнікаў, якія ахоўваюць сталіцу ад фашысцкіх налётаў, ні страляніны зянітных гармат. Толькі рэдкія ўспышкі пражэктара напамінаюць аб тым, што зацемненая Масква пільна і насцярожана сочыць за цішынёй.

Такою ноччу на адной з маскоўскіх таварных станцый Н-ская танкавая часць рыхтавалася для адпраўкі на фронт.

Капітан Палаўчэня, камандзір батальёна, атрымаўшы тут-жа на станцыі баявую матэрыяльную часць і людзей, заклапочана бегаў па платформе. Ён рупіўся аб тым, каб усё было ў парадку.

Капітан быў малады, рухавы і, як здалося яго людзям, яго новаму экіпажу, занадта ўжо мітуслівы. Вось ён спыніўся, зірнуў на ручны гадзіннік і весела абвясціў:

— Роўна поўнач! От, здорава. Разам з наступаючым сорак другім адпраўляемся ў дарогу.

Экіпажу хацелася бліжэй пазнаёміцца з сваім камандзірам. Першым пачаў гаворку вежавы стралок:

— Таварыш капітан, нешта ў вас прозвішча ні то рускае, ні то не рускае...

— Прозвішча маё,—пачаў Палаўчэня і не даказаў. —Вось ты, Бандарэнка, — украінец, вадзіцель наш Пушкарскі — рускі, камандзір гарматы Гольцман—яўрэй, а я—беларус. Стала быць, у нас не экіпаж, а проста дружба народаў...—і Палаўчэня весела засмяяўся.

Гэта добра, што новы камандзір такі задушэўны чалавек. Ён гаворыць, што яму ўжо за трыццаць год, а на выгляд яму не больш дваццаці. І гэта добра. Можна быць з ім як з роўным... А ці даўно ён у танкавых часцях?

— Не, таварышы,—адказвае капітан. —Танкіст я зусім малады.

Наогул-жа ў Чырвонай Арміі ўжо дванаццаць год. Служыў у конных узводах пяхотных палкоў. Потым быў пераведзены ў аўтараневую часць. Машыну ён палюбіў не менш чым каня, і хутка асвоіў яе, сам кіраваў вучэбнай ротай. Але гусенічная машына яго больш захапіла, і ён стаў вывучаць танк. Вайна застала яго ў аўтатранспартнай часці камандзірам роты, і ў першы-ж дзень ён разам з ротай быў накіраваны на фронт. Праз некаторы час яго часць была адпраўлена на пераформіраванне, а яго самога паслалі ў танкавую часць.

— Так што, проста скажу, у танкавай справе я навічок,—закончыў свой расказ Палаўчэня.

Ніхто пытанняў больш не задаваў. Наступіла працяглае маўчанне. Палаўчэня адчуў, што

яго новыя таварышы, і асабліва вопытны, спрактыкаваны вадзіцель Пушкарскі, хочуць яго спытаць — як-жа ты, капітан, будзеш камандаваць танкавым падраздзяленнем, не будучы сам умелым танкістам?

## 2

У дзень прыбыцця на месца капітан Палаўчэня атрымаў загад — сумесна з пяхотным стралковым злучэннем прарваць пярэдні край абароны праціўніка і знішчыць яго агнявыя кропкі, якія стрымліваюць нашу пяхоту.

Па плану камандавання належала заняць горад Пено. Тут арудавала часць брыгады СС «Мёртвая галава», якая выхвалялася сваёй непераможнасцю.

Палаўчэня хваляваўся: з экіпажам свайго галаўнога танка ён амаль не знаёмы, камандзіраў машын свайго падраздзялення ён таксама не ведае; больш таго, ён нават не паспеў правесці са сваімі танкамі вучэбных выхадаў. Аднак, ён добра сабе ўцяміў: аснова бою—гэта поўнае і абсалютнае ўзаемнае дзеянне танкаў з пяхотай, і што танкі павінны сваёй бранёй і агнём у час узяць пад абарону сваю пяхоту, якая ідзе ўслед за імі. Пра гэтае непахіснае правіла капітан Палаўчэня сказаў камандзірам свайго падраздзялення перад выступленнем на выкананне задання.

Камандзіры стралковых рот, з свайго боку, выкладаючы байцам план прадстаячага бою, растлумачылі: калі танку трэба паказаць накірунак варожай агнявой установкі, дык рабі

гэта вінтоўкай, лапатай, рукой, зламанай галінкай—абы толькі танкіст убачыў і зразумеў цябе. Былі таксама вылучаны байцы для стральбы трасіруючымі кулямі на выпадак выкрыцця цэлі, ва ўзводах былі прызначаны спецыяльныя сувязныя. Але Палаўчэня ўсё яшчэ непакоіўся: ці ўсё хаця ўлічана і прадумана.

Спачатку загаварыла артылерыя, расчышчаючы шлях наступаючым танкам. За танкамі рушыла пяхота.

Адкрытыя подступы не давалі магчымасці ісці дарогай. Палаўчэня скамандаваў:

— Разгарнуцца і прайсці па цаліне.

Танкі ішлі цераз яры і па ўзгорках. Месцамі снег быў такім глыбокім, што машыны хаваліся па самую вежу. На галаўным танку ад вялікай нагрузкі матор зменшыў абароты. Палаўчэня ўстрывожыўся: у першым баю ўжо няўдачы. Але спрактыкаваны Пушкарскі пераключыў хуткасць і спрытна вывеў машыну.

Раптам праціўнік моцна ўдарыў па наступаючых. Загаварылі варожыя мінамёты і супрацьтанкавыя гарматы. Адзін з нашых танкаў спыніўся — падбілі гусеніцу. Гэта была першая і, што называецца, сапраўдная сустрэча маладога капітана з ворагам. Ці справяцца яго танкі з такімі цяжкімі перашкодамі? Ён акінуў поглядам сваіх таварышаў па машыне, і яму здалося, што экіпаж пытаецца: «Ну, што будзе, капітан?»

Мільганула думка: ад танкаў залежыць поспех пяхоты, зыход бою. І капітан адкрыў

агонь. Першымі-ж выстраламі лейтэнант Гольцман прымусіў замаўчаць шэсць варожых агнявых кропак.

Экіпажы другіх машын дзейнічалі не менш паспяхова. Тэмп варожай стральбы стаў прыкметна зніжацца. Пад прыкрыццем сваіх танкаў пяхота прасоўвалася наперад. Адлегласць да намечаных рубяжоў хутка скарачалася. Вораг апомніўся і зноў павёў агонь. Капітан Палаўчэня загадаў узмацніць атаку і сам на сваім танку паказаў прыклад. Вежавы стралок Бандарэнка спрытна і хутка заражаў гармату, а лейтэнант Гольцман паліваў варожыя дзоты і бліндажы смяротным агнём.

І ні адзін танк не адставаў ад галаўнога.

Нарэшце хлынула пяхота.

Стаяў люты мароз. Але ад вялікага парыву людзей, ад іх дыхання паветра здавалася цёплым. Далёка, далёка навокал нёсся гул наступлення. Зямля дымілася пылам. Ад умёрзлай цаліны не засталося і следу. Ад чырвонаармейскіх ботаў і валёнак снег стаў чорным і шэрым на многа кіламетраў.

Варожая абарона зламана. Пяхота ўварвалася ў населены пункт. Фашысты ўжо не вялі агню, яны пахаваліся ў хатах і хлявах. Але куды-б яны не залазілі, байцы іх знаходзілі і выпорвалі.

Няспынна сочачы за боем, Палаўчэня заўважыў, што на левым флангу пяхоце патрэбна дапамога.

Павярнуць танк улева!

Вадзіцель Пушкарскі павёў машыну на цэль. Наступнай камандай Палаўчэня адкрыў агонь. Вежавы стралок моўчкі падаваў снарады. Камандзір гарматы вёў агонь і пры патрэбе пускаў у ход абодвы кулямёты. Дапамога аказалася своечасовай: і на левым флангу пяхота зваліла ворага. Зусім нечакана аднекуль застрачыў аўтамат, паліваючы вуліцу градам куль. Стралкі залеглі ў снег. У гэты час Пушкарскі праз назіральную шчыліну ўбачыў чалавека, які поўз да танка.

— Прыдушыць?—спытаўся ён поглядам і ўжо хацеў было павярнуць машыну.

— Стой!—спыніў яго камандзір.—Здаецца, наш.

Вакол таго, хто поўз, сыпаліся кулі, здымаючы пырскі снегу. Гэта страляў па ім фашысцкі снайпер. Але баец не пераставаў паўзці, і, дабраўшыся да машыны, лапаткай паказаў убок высокага будынку. Палаўчэня прыпаў да аптычнай прылады і ўбачыў, што нямецкі аўтаматчык хаваецца там за комінам.

Адзін залп з гарматы, і бандыт разам з комінам узляцеў у паветра.

Першы пояс прарваны. Населены пункт вызвалены. Наперадзе горад Пено.

Танкі, прыкрываючы пяхоту, рушылі далей да асноўнага вузла супраціўлення немцаў на гэтым участку. Тут кожная будыніна была ператворана ворагам у своеасаблівы дзот, дзе сядзелі кулямётчыкі і аўтаматычыкі. Як толькі з'явіліся першыя байцы, фашысты адкрылі моцны заградждальны агонь і затрымалі насту-

паючых. Асабліва былі ўмацаваны ўскраіны горада.

— Што будзем рабіць?—звярнуўся Палаўчэня да сваіх таварышаў і сам-жа адказаў.— У першую чаргу трэба выбіць падлюг з найбольш умацаваных пазіцый, заняць іх, і адтуль ужо развіваць поспех.

Палаўчэня ўмоўным знакам перадаў экіпажам машын:

— Агнём усіх танкаў ударыць па флангах!

Першымі ўдарамі немцы былі выбіты з пяці дамоў. Ідучая ўслед за танкамі пяхота хутка пранікла ў гэтыя дамы і замацавалася. Тым часам танкі прадаўжалі ісці з абодвых ускраін, знішчаючы варожыя агнявыя кропкі. Стралкі кулямётным і вінтовачным агнём завяршалі справу, пачатую танкамі.

Гітлераўцы залезлі на вышкі, сталі адстрэльвацца, але і адтуль іх выкурылі. Гітлераўцы не вытрымалі і пабеглі. Але ўсюды іх насцігала смерць. Яны кінуліся ў лес, пакідаўшы свае каскі, мундзіры, а многія—нават без ботаў, босымі. Толькі і лес іх не ўратаваў; там іх знішчалі лыжнікі.

Назіральная шчыліна ў танку вельмі вузкая, а дзень на зыходзе, — скора змеркнецца зусім. Але ў капітана вочы маладыя, і куды ні зірне ён — усюды ляжаць нямецкія трупы.

— Проста, як кучы гною, — заўважыў капітан.

— Зірні, як за зямлю ўчапіўся, — паказаў Бандарэнка на забітага фашыста, які ляжаў ніцма. — Зямлі хацеў, вось і вазьмі, сволач!

Над будынкам клуба развяваўся чырвоны сцяг.

Горад Пено зноў савецкі.

І «Мёртвая галава» ператварылася ў мноства мёртвых галоў...

Танкісты вышлі з машын. Добра пасля гарачага бою глынуць чыстага студзеньскага паветра.

У горадзе вакол гарэўшых дамоў блукалі самотныя постаці. Гэта на папялішчы вярнуліся людзі, выгнаныя немцамі на мароз. Непадалёк у неба ўзнімаўся густы чорны дым, відаць, гарэў вялікі будынак.

Палаўчэня разам з вежавым стралком і камандзірам гарматы накіраваўся туды. Перад іх вачамі адкрылася жудасная карціна. Байцы і камандзіры тушылі дом. З-пад палаючых бярвенняў і дошчак яны выцягвалі абвугленыя трупы чырвонаармейцаў, мірных жыхароў—мужчын, жанчын і дзяцей. Побач з пажарышчам стаяла шыбеніца, з якой чырвонаармейцам удалося ў час зняць і ўратаваць жанчыну.

Яна расказала, што немцы, сагнаўшы людзей у гэты дом, доўга над імі здзекваліся і мучылі іх, а потым дом падпалілі, каб спаліць усіх, хто ў ім быў.

Лейтэнант Гольцман і капітан Палаўчэня разам цягалі абгарэлыя дошкі і бярвенні, шукаючы загінуўшых людзей.

— Мусіць, з маімі старымі яны таксама зрабілі...—прамовіў Гольцман. —Яўрэі... Хаця,

для яўрэяў у іх другі спосаб — жывымі закопваць.

— Для людаедаў усёадно яўрэй, рускі ці беларус, — сказаў Палаўчэня і паказаў на абвугленыя трупы.

## 3

Пено ўжо ззаду.

Наперадзе Андрэапаль.

Па дарозе да яго належала перайсці цераз возера Охват, узяць некалькі населеных пунктаў, вельмі ўмацаваных немцамі. Адыходзячы, вораг узарваў пераправу цераз возера і ўдарыў з артылерыі і мінамётаў. У адказ загаварыла наша артылерыя.

Камандаванне загадала: да 4.00 пераправа павінна быць устаноўлена.

Сапёры прыступілі да работы. Пераправу будавалі пад жорсткім агнём варожай артылерыі. Стаяў люты мароз. Суткі працавалі сапёры, не спыняючыся ні на міг. Сюды, да берагу, пад'язджалі кухні, тут, адстрэльваючыся ад немцаў, людзі елі, і зноў ішлі на возера.

К чатыром гадзінам пераправа была гатова.

Капітан Палаўчэня, які стаяў у чаканні са сваімі танкамі, атрымаў загад адразу-ж пераправіцца на той бок возера і падрыхтавацца да атакі.

Пушкарскі спытаўся — ці вытрымае пераправа танкі.

— А мы праверым,—сказаў Палаўчэня. — Я ад бацькі навучыўся: сем разоў прымерай, адзін раз адрэж.

Спачатку капітан пусціў лёгкі танк. Ніякай асадкі пераправа і знаку не дала. Потым быў пушчаны сярэдні танк—камандзірскі. І гэтую пробу пераправа вытрымала. А вось трэці танк—цяжкі КВ не змог прайсці: пераправа стала асядаць. Цяжкія танкі пакінулі ў рэзерве.

Немцы не спынялі агню па пераправе ні на хвіліну. Але і Палаўчэня не спыняў свае работы: ён пераправіў восем лёгкіх танкаў і свой, сярэдні.

Рота лыжнікаў накіроўваецца ў абход і ўдарае па праціўніку з правага флангу, Палаўчэня з сваёй дзевяткай танкаў ідзе ў атаку. Ён б'е ворага ў самы лоб.

Снег быў такім глыбокім, што лёгкія танкі не маглі ісці сваім ходам. Капітан браў іх на буксір і выцягваў на дарогу. Падпусціўшы калонну Палаўчэні на выгадную адлегласць, фашысты адкрылі шалёны агонь. Дэсант аўтаматчыкаў, які быў на камандзірскім танку, спешыўся і пачаў ісці ззаду калоны. Танкі ўдарылі з усіх гармат, але праціўнік не адступаў. Наадварот, ён узмацніў агонь. Палаўчэня быў вымушаны звярнуць з дарогі. Вышаўшы на цаліну, танкі зноў пачалі вязнуць у снезе і адсталі ад галаўнога.

Але Палаўчэня не спыняўся. Яго танк ішоў наперад, а ўслед за ім—аўтаматчыкі.

Праціўнік, бачачы, што на яго ідзе толькі адна машына, рашыў прапусціць яе цераз свой пярэдні край абароны, а пяхоту адрэ-

заць. Немцы так і зрабілі. Дэсант вымушаны быў залегчы і акапацца.

Танк Палаўчэні, прарваўшы варожую лінію абароны, панёсся наперад. Вось ужо першая вёска за лініяй фронта. Праз назіральную шчыліну капітан убачыў сцяну. Вуліца вёскі была загароджана аўтамашынамі, павозкамі, санямі, палявымі кухнямі. Аднекуль, зусім паблізу, ударыла супроцьтанкавая гармата. Снарады клаліся каля самага танка.

— Далей ісці немагчыма, — заявіў Пушкарскі.

Палаўчэня скамандаваў:

—Поўны ход! Гусеніцамі зламаць перашкоды, раздавіць гармату.

Танк зрабіў разварот на месцы, на хвілінудругую прыпыніўся, быццам падрыхтаваўся да прыжка, і рвануўся наперад. Фашысты кінуліся з енкам ва ўсе бакі. Машыны ўзлазілі адна на другую, коні станавіліся на дыбкі. Сталёвая крэпасць імчалася па машынах і павозках, нібы з узгорка на ўзгорак, і ператварала ўсё ў трэскі, у скрамсаны метал. У сценкі танка барабанілі кулі, білі асколкі снарадаў, але капітан іх не чуў.

— Наперад, Пушкарскі, наперад!—патрабаваў ён.

Вёска засталася ззаду. У наступнай вёсцы—такі-ж малюнак—і тут танк пайшоў па заслону, знішчаючы ўсё на сваім шляху. Раптам капітан звярнуўся да вадзіцеля.

— Вельмі далёка мы ад'ехалі ад сваіх. Кі-

лометраў пяць праскочылі. Павярні аглоблі, Коля.

Пушкарскі павярнуў назад. Не паспеў танк прайсці і кілометра, як зусім блізка ўдарыла гармата і першым-жа снарадам прабіла бак. Пацякло гаручае. Матор пачаў глохнуць. Астаноўка немінучая. Але вопытны вадзіцель хутка перакрыў кранік, перайшоў на правы бак і хацеў было развярнуцца. Нечакана з'явіліся дзесяткі са два варожых салдат. Фашысты, як мухі, абляпілі танк, узлезлі на вежу і пачалі стукаць з усіх сіл:

— Рус, вылазь! Здафайсь...

Палаўчэня ўключыў маторчык і стаў шпарка варочаць вежу. Некалькі фашыстаў скінуліся, астатнія ўчапіліся, як кляшчы, і прадаўжалі кружыцца разам з вежай.

Танк зноў стаў разварочвацца і, каб не даць падыйсці немцам, пачаў страляць з абодвых кулямётаў. Але фашыстам удалася анучамі заткнуць усе назіральныя шчыліны. Танк застаўся без вачэй.

— Калі так, давай сяду бліжэй да цябе,— сказаў Палаўчэня і сеў на месца радыста-кулямётчыка, побач з механікам. Адсюль зручней кіраваць машынай.

Духата ў танку была такая, што цяжка стрываць. Палаўчэня скінуў з сябе гімнасцёрку і застаўся ў адной кашулі. Рупіла толькі адна думка—гнаць машыну да сваіх. Але тут ён заўважыў на сваёй кашулі кроў.

— У цябе-ж кроў з роту ідзе!—сказаў спалохана Пушкарскі.

Але капітан нічога не адчуваў. Фашысты, імкнучыся пашкодзіць кулямёт, нечым цяжкім ударылі па ствале. Кулямёт, мусіць, быў недастаткова ўмацаваны і ўнутранай часцю ўдарыў па твары камандзіра. Перамагаючы боль, Палаўчэня гнаў машыну наперад.

Немцы, трымаючыся за вежу, прадаўжалі стукаць па брані.

— Рус, здавайся!

А Палаўчэня думаў пра сваё: тут, недзе паблізу, было дрэва,—значыць, трэба зрабіць разварот. І ён разам з механікам павярнуў танк.

— Цяпер паедзем проста.

— Трапім у возера.

— Усёроўна! Ехаць!

А камандзіру гарматы ён загадаў эканоміць боепрыпасы—яны яшчэ спатрэбяцца.

Раптам танк ударыўся аб нейкую будыніну. Спыніліся. Па шуме, які чуваць было звонку, экіпаж зразумеў, што яны трапілі ў нейкую вёску. Але ў чыіх яна руках—у нашых ці варожых?

— Па тым, як трымаюць сябе нашы «пасажыры» на вежы,—сказаў Палаўчэня,—я адчуваю, што нашых тут няма.

І ён загадаў даць задні ход, абмінуць будынак, і зноў ісці наперад.

Фашысты, бачачы, што савецкія танкісты не здаюцца, а ўпарта прабіраюцца да сваіх, рашылі знішчыць і танк і экіпаж. Яны накінулі на вежу брызент, абліты бензінам, і падпа-

57328

лілі. Скора ўедлівы дым стаў пранікаць у танк, а браня стала награвацца.

— Гарым!—сказаў вежавы стралок.

Палаўчэня спакойным голасам загадаў:

— Больш газу! Прыбавіць хуткасць!

Танк імчаўся, як паранены звер. Дым стаў выядаць вочы, не было чым дыхаць.

— Агонь!—прадаўжаў камандаваць капітан. Ён сам і ўвесь яго экіпаж працавалі з усіх сіл.

Танк зноў у полі. Пачынала змяркацца. Полымя, абхапіўшае танк, развейвалася на ўсе бакі. Здавалася, страшная вогненная істота імчыцца па зямлі, каб датла выпаліць карычневую чуму. Такім танк уварваўся ў наступную вёску. Немцы кідаліся ад яго—хто куды.

— Яшчэ прыбавіць хуткасці!—патрабаваў Палаўчэня.

Разлік у яго быў такі: а можа патокам паветра сарве палаючы брызент. Але брызент не зрываўся. Анучы-ж у назіральных шчылінах выгаралі, і вадзіцель убачыў накірунак.

Жар у машыне не спадаў, а ўзмацняўся. А што калі ўзарвуцца снарады? Капітан прыпаў да шчыліны.

— Што, таварыш капітан?

— Ці не вельмі блізка ля лесу? Лясы тут хвойныя—падпалім, шкоды наробім.

Павярнулі ў поле. Нечакана аднекуль з'явіўся варожы батальён. Немцы адкрылі страляніну. Кулі барабанілі па брані, як гарох.

— Асколачным!—скамандаваў капітан.

Гольцман ударыў з гарматы, а камандзір прыпаў да кулямёта і даў доўгую чаргу.

— Гусеніцамі!

Вадзіцель павёў палаючы танк проста на немцаў.

Палаўчэня зноў загадаў уключыць вышэйшую хуткасць. Разлік апраўдаўся: дзякуючы вялікай хуткасці, брызент, нарэшце, быў сарваны.

Праз некаторы час танк пачаў астываць і людзям стала лягчэй дыхаць.

Нарэшце дабраліся да сваіх. Капітан адчыніў люк і пачуў родныя галасы. Непадалёк стаялі танкі. Сувязны падпоўз да машыны і, пазнаўшы Палаўчэню, далажыў, што гэта яго-ж лёгкія танкі, якія адсталі, і што камандзір стралковага батальёна разам з ротаю лыжнікаў таксама тут. Палова вёскі яшчэ ў руках фашыстаў. Група нямецкіх салдат забралася ў царкву, устанавіла ў вокнах і на званіцы кулямёты і не дае нават падняцца нашай пяхоце.

Палаўчэня сеў у танк і накіраваўся да камандзіра батальёна. Камбат падпоўз да машыны.

— Палаўчэня! А мы лічылі, што ты загінуў.

— Гінуць будуць немцы,—сказаў Палаўчэня і папрасіў арыентыр. Даведаўшыся, адкуль вораг вядзе агонь, ён сказаў:

— Я іх зараз адтуль выкуру, а вы падрыхтуйцеся да атакі. І, зрабіўшы разварот, ён скамандаваў:

— Бранебойным!

Кулямёты і аўтаматы на званіцы і ў вокнах царквы адразу-ж сціхлі. Праз хвіліну ўдарыў агонь з падвала царквы. Але дакладна ўстанавіць адкуль б'юць—было цяжка, бо ўжо зусім сцямнела. Капітан папрасіў у камбата дазволу падпаліць які-небудзь блізкі ад царквы будынак.

— Давай лазню.

Падпаленая снарадам лазня добра асвятліла ўсё навакол. Пяхота пайшла ў атаку. Экіпаж Палаўчэні выскачыў з танка і таксама разам з усімі кінуўся на ворага. Адна за другой замаўкалі варожыя агнявыя кропкі, устаноўленыя ў прабоінах мураваных сцен царквы. Хутка з падвала вылез немец з белым сцягам у руцэ.

— Здаёмся.

У капітана Палаўчэні ад доўгага знаходжання ў танку не згіналіся калені, звінела ў вушах, усё яшчэ балела сківаца. Але ён нічога не адчуваў, ён бачыў толькі апушчаную галаву пераможанага немца.

— Зброю пакінуць у падвале,—загадаў ён палоннаму. —Усім выйсці.

Прыбег баец з данясеннем: у школе фашысты яшчэ трымаюцца і вядуць адтуль агонь.

Разам з камандзірам батальёна і трыма чырвонаармейцамі Палаўчэня накіраваўся да школы. Цемра яшчэ больш згусцілася. Усе трымаліся адзін каля другога, каб не заблудзіць. Раптам з вышак школы раздаліся выстралы. Аднаго байца забіла, камандзіра ба-

тальёна параніла, а ў Палаўчэні куляю прабіла шынель. Ён кінуўся назад да танкаў. Знайшоўшы, што ў сваім ужо вышлі ўсе боепрыпасы, ён загадаў прычапіць да свае машыны два лёгкіх танкі і адкрыць з іх агонь. Услед за танкамі ўдарыла пяхота. Нямецкія аўтаматчыкі кінуліся са школы, каб уцячы ў лес, але лыжнікі даганялі іх і знішчалі.

Вёска была поўнасцю ачышчана ад немцаў.

Палаўчэня з'явіўся ў штаб арміі. Ён быў успацелы, змардаваны, але шчаслівы. Намеснік камандуючага арміяй абняў яго і пацалаваў.

— Пра ваш подвіг, капітан, ужо гаворыць увесь фронт.

Капітан хацеў было адказаць, але генерал па-сяброўску пасадзіў яго побач з сабой і сказаў:

— Яшчэ ў баю за Пено я пераканаўся, што вы зусім правільна зразумелі і ажыццявілі ўзаемнае дзеянне танкаў з пяхотай, але сёнешні ваш подвіг—бяспрыкладны.

І праўда, за час гэтага пахода танк Палаўчэні знішчыў некалькі сот немцаў, захапіў сотні павозак, звыш 50 аўтамашын, 42 коні, шэсць мінамётаў, шмат матацыклаў, раздушыў гусеніцамі дзве гарматы. І самае галоўнае: дзякуючы мужнай вытрымцы і волі, выратаваў сябе, сваіх людзей і свой танк ад пагібелі.

— Вы-ж былі ў танку звыш дванаццаці гадзін. Цяпер вам трэба адпачыць,—сказаў генерал.

Капітан, памыўшыся, перад люстэркам прычэсваў свой чубок. Але чубок у капітана з капрызам. Колькі не прычэсвай, ён віхрыцца ўсёадно і надае капітану яшчэ больш юнацкі выгляд. Пушкарскі і Гольцман, пасмейваючыся над франтаўством капітана, увіхаліся каля стала. На простым сялянскім стале ляжаў накроены хлеб. Смачна пахла капустай і падсмажанай бульбай.

Капітану здалося, што ён не на фронце, а ў сябе ў вёсцы Языль. Жылі яны не ў самай вёсцы, а наводшыбе, непадалёку ад станцыі Урэчча, што па дарозе са Слуцка на Мінск. Тады яму, каб дапамагчы сям'і, даводзілася хадзіць на заработкі. Беларусь, разбураная акупантамі, залечвала свае раны. Усюды патрэбны былі рабочыя рукі. І Гаўрыла Палаўчэня хадзіў на суседнюю чыгунку ўлетку вазіць пясок, падносіць каменне, а зімою—на расчыстку каляі. Толькі ў нядзелю прыходзіў дадому.

Добра адпачыць у цёплай хаце пасля цяжкай работы.

— Ну, хлопцы, за стол,—весела сказаў капітан і ад здавальнення пацёр рукі.

Але ў гэтую хвіліну ўвайшоў баец і прынёс загад: разам з пяхотным злучэннем неадкладна выступіць на дапамогу часцям, якія наступаюць на Андрэапаль.

Так і не ўдалося павячэраць. Праз якую хвіліну капітан са сваімі людзьмі ўжо быў у

танку. Услед за ім ішло шэсць лёгкіх танкаў, а за імі, як звычайна,—пяхота.

Была ясная, марозная раніца. Групы гітлераўцаў, якія прыкрываюць адступленне сваіх часцеў, амаль без промаху знішчваюцца прыцэльнай стральбой. Вось ужо відаць і Андрэапаль, але каб дабрацца да яго, трэба перайсці раку. Толькі ці вытрымае стары мост?

Перадаўшы камандаванне батальёна камандзіру танкавай роты і загадаўшы яму пераправіцца толькі з лёгкімі танкамі, Палаўчэня накіраваўся ў штаб далажыць аб становішчы.

У штабе рашылі: лёгкія танкі ў руках вопытнага камандзіра, няхай капітан застанецца на ахове штаба. У гэты час у штаб паведамілі: праціўнік з Андрэапаля перайшоў у наступленне на левы фланг нашых часцей, адцясніў іх і заняў вёску.

Генерал спытаўся:

— Капітан Палаўчэня, колькі ў вас танкаў?

— Тут адзін, таварыш генерал.

— Што-ж будзем рабіць, дружа?

— Дазвольце мне, таварыш генерал, на сваім танку разагнаць іх к чортавай матары... —і Палаўчэня занепакоіўся, яму стала няёмка. — Вінават, таварыш генерал.

Генерал усміхнуўся:

— Нічога. З песні слова не выкінеш... Ну... —ён падаў Палаўчэні руку. —Жадаю поспеху.

Танк імчаўся на перадавую. Пяхота, убачыўшы свой танк, абрадавалася. Стралкі ўзняліся і пад прыкрыццём танка пайшлі ў атаку. Немцы адкрылі моцны агонь. Пяхота

зноў вымушана была залегчы, але адна рота з левага флангу—агародамі знянацку ўдарыла па ворагу і адрэзала яму шлях адступлення на чыгуначную станцыю. Скарыстаўшы момант разгубленасці і збянтэжанасці ў стане ворага, Палаўчэня агнём з свайго танка ўдарыў у другім накірунку. Пяхота рынулася ў штыкавую. Раптам з-за вугла вынырнулі два фашысцкіх танкі і ўдарылі па Палаўчэні.

— Бранебойным!—загадаў капітан.

Гэта быў цяжкі бой. З фашысцкіх танкаў стралялі ва ўпор. Але Палаўчэня не адступіў. Былі падпалены абодва танкі. Ад іх паваліў густы чорны дым.

Фашысты забраліся ў мураваную лазню і сталі страляць з кулямётаў і аўтаматаў. Камандзір стралковай роты падпоўз да танка Палаўчэні і пастукаўся. Капітан адкрыў люк.

— У лазні, кажаш?—перапытаў Палаўчэня. —Стала быць, трэба іх добра папарыць.

І ён загадаў адкрыць агонь па лазні.

Пяхота выбіла немцаў з вёскі і замацавалася ў ёй.

Капітан рашыў накіравацца ў штаб і далажыць, што загад выкананы. У гэты час падышоў стары селянін і падаў знак, што хоча нешта паведаміць. І ён расказаў, што немцы хочуць адправіць са станцыі эшалон нарабленага дабра ў Тарапец. Танк накіраваўся да станцыі. Але па дарозе, як на тое ліха, завяз у балоце. Пачуліся чужыя галасы. Гэта былі немцы. Яны з усіх сіл стукалі па вежы танка.

— Выходзь, рус'

Не дачакаўшыся адказу, фашысты пазатыкалі назіральныя шчыліны і зніклі.

Ужо знаёмая цемра зноў запанавала ў танку.

— А ці не падышлі нашы? — спытаўся Гольцман.

— Магчыма,—адазваўся капітан.

Ён хутка склаў данясенне камандуючаму і перадаў яго Бандарэнку.

Але як выйсці з танка? Праз дэсантны люк не выберашся, — машына ў вадзе, у рэчцы. Праз верхні палезеш — заб'юць.

Танкісты, прыадкрыўшы люк, высунулі на палачцы шапку. З хвіліну было ціха. Бандарэнка ўжо нарыхтаваўся было вылазіць, калі пачуліся стрэлы. Шапку прастрэлілі ў шасці месцах. Праз нейкі час з асцярожнасцю зноў прыадкрылі люк. Марознае паветра хлынула ў танк. Стала лягчэй дыхаць. Зноў высунулі шапку. Прайшло пяць—дзесяць хвілін — ціха. Бандарэнка рашыў накіравацца ў штаб, але Палаўчэня параіў пачакаць досвітку, а пакуль ачысціць назіральныя шчыліны.

Калі пачало днець, нечакана пачуўся такі моцны ўдар па танку, што скаланулася вежа. Гольцман зірнуў у тэлескапічны прыбор.

— Па нас страляе гармата прамой наводкай. Адлегласць метраў сто—не болей.

— Разбіць гармату!

Першы залп—міма. Другі—пацэлілі. Гармата змоўкла.

У небе паказаліся самалёты. Яны скінулі некалькі бомб. Бомбы ляглі блізка ля танка. Самалёы сталі кружыць над станцыяй, ахоў-

ваючы эшалон, які гатовы быў у дарогу. Да станцыі заставалася не больш кілометра.. З танка добра было відаць і станцыю і поезд.

— Колькі ў нас яшчэ снарадаў?

— Дзевяць штук.

— Што-б там не сталася—разбіць паравоз і затрымаць эшалон.

Вадзіцель Пушкарскі з любоўю зірнуў на свайго камандзіра. Усяго толькі два тыдні мінула ад той новагодняй ночы, калі ён паступіў у распараджэнне маладога капітана, і, што таіцца, быў нездаволены, што трапіў у экіпаж нявопытнага танкіста. А цяпер ён знае, што з такім камандзірам дарма не загінеш, з ім лёгка ў самыя цяжкі хвіліны. Танк пачаў біць па станцыі. Тады нямецкія самалёты зноў сталі бамбіць машыну Палаўчэні, але нерухомая крэпасць прадаўжала біць, і шостым снарадам зваліла паравоз.

Хутка экіпаж Палаўчэні пачуў гул танкаў. Людзі пераглянуліся: нашы ці не нашы?

Танкі падышлі зусім блізка.

— Нашы!—закрычалі ўсе радасна.

— Гэта-ж нашы лёгкія танкі.

Трэба выцягнуць з ракі танк і ісці разам. Але як не цягнулі яго лёгкія танкі—не маглі скрануць і з месца. Толькі з дапамогай двух падышоўшых сярэдніх танкаў удалося вырваць танк Палаўчэні з балота. Танкі пайшлі на Андрэапаль.

Праціўнік спешна падкідваў падмацаванні і любой цаной стараўся ўтрымаць гэты горад. У лютую сцюжу, на глыбокім снезе нашы

часці падышлі да города з трох напрамкаў. Наступленне пачалося з самага ранку. Адно падраздзяленне авалодала чыгуначнай станцыяй і захапіла гружаны эшалон, паравоз якога разбіў танк Палаўчэні. Другая часць выйшла на ўскраіну горада. Тым часам падышла артылерыя і танкі з другога боку, адкуль іх не чакаў вораг. Артылерыя расчысціла шлях пяхоце. Стралкі ўвайшлі ў горад. Завязаліся жорсткія вулічныя баі. Восем гадзін біліся на вуліцах горада. На дапамогу пяхоце, разам з іншымі танкавымі падраздзяленнямі, у цэнтр Андрэапаля ўварваліся машыны капітана Палаўчэні. Ніколі яшчэ экіпаж не бачыў свайго камандзіра такім разлютаваным. Танк даганяў уцякаючыя зграі бандытаў і касіў іх з кулямёта, душыў гусеніцамі...

У штабе арміі камандуючы моцна паціснуў Палаўчэні руку і сказаў:

— Вы прадстаўлены да вышэйшай урадавай узнагароды.

— Служу Совецкаму Саюзу.

— Вы беларус?

— Так, таварыш генерал.

— Я назваў-бы... — генерал падумаў і сказаў,—я назваў-бы вас «беларускі Чапаеў...»

5

Танкі капітана Палаўчэні восем дзён былі ў няспынных баях. Такія гарады, як Пено, Андрэапаль, Тарапец былі ператвораны гітлераўцамі ў вельмі моцныя вузлы супраціўлення. І ў тым, што яны былі ўзяты нашымі

мужнымі байцамі, нямалую ролю адыграў капітан Палаўчэня са сваімі танкамі. Цяпер пасля гарачых баёў людзі яго падраздзялення атрымалі пяць дзён на адпачынак.

Але не паспеў капітан размясціцца на адпачынак, як яму далі новае неадкладнае баявое заданне. Трэба было не даць праціўніку выйсці на шасе. Ці ўсё напагатове? Усё. Але экіпаж танка просіць затрымацца на некалькі хвілін.

— Якая прычына?

— Ты член партыі, таварыш капітан?

Пытанне яго здзівіла. Ён ужо ім расказваў, што ён у партыі з таго часу, як і ў Чырвонай Арміі—з дваццаць дзевятага году.

— Вось мы і хочам, каб увесь экіпаж нашага танка быў партыйным. Рэкамендуеш нас?

І тры яго таварышы выехалі на новае баявое заданне як большэвікі—партыйцы.

Прабіраліся ўночы. Зноў лёгкія танкі завязлі ў снезе. Пачуўшы шум мотараў совецкіх танкаў, немцы адкрылі агонь. Пушкарскі папрасіў сапёраў, каб яны зрабілі некалькі моцных тросаў, з дапамогай якіх можна будзе выцягнуць танкі са снегу.

— Але-ж, каб зрабіць трос зойме не менш, як усю ноч, а па загаду камандавання раніцай трэба ўжо быць на месцы.

Можа пакінуць лёгкія танкі часова тут, а сярэднім танкам ісці наперад? Не. Абстаноўка патрабуе ісці ў бой з усімі танкамі.

— Зробім поезд... — ажывіўся капітан. І загадаў: да кожнага сярэдняга танка прыча-

ціць па пяць лёгкіх і з дапамогаю ўласнага ходу і з сілаю «цягача» прадаўжаць марш.

Пушкарскі зірнуў на таварышаў. Яны без слоў зразумелі адзін аднаго. Колькі вынаходлівасці і кемлівасці ў іх камандзіра!

І як толькі эшалон крануўся з месца, немцы яшчэ больш узмацнілі агонь. Тады капітан загадаў ударыць па ворагу з усіх гармат. Расцягнуўшыся ланцугом, танкі ішлі наперад і прыбылі на месца якраз у вызначаны тэрмін. Тут, аднак, высвятлілася, што немцы ўсё-ж вышлі на шасе. Трэба было атакаваць праціўніка і любой цаной авалодаць гэтай важнейшай камунікацыяй.

Танкі ўдарылі ворагу ў лоб, а пяхота, абышоўшы, атакавала з флангаў. Цяпер танкі ўжо ішлі не ланцугом, а ў разгорнутым парадку,—і ўдар іх быў яшчэ больш магутным. Вораг быў адкінуты далёка на захад.

## 6

У тым 1942 годзе вясна выдалася позняй. Мінула ўжо першамайскае свята, а ў лагчынах яшчэ ляжаў снег. Нават на ўзгорках зямля была вязкай. Пакуль не падсохне, танкі вымушаны стаяць. У гэтыя дні Палаўчэні было загадана адправіцца на перадавую і прыняць танкавы батальён, камандзір якога быў цяжка паранены. Уночы капітан выбраўся ў дарогу. У трох кіламетрах ад перадавых яго сустрэў сувязны і ўручыў пакет. У ім было сказана, калі і ў якім напрамку атакаваць ворага.

Палаўчэня зірнуў на гадзіннік. Засталося вельмі мала часу. Трэба спяшацца.

— Матэрыяльная часць у парадку? Людзі гатовы?—гэта былі яго першыя словы, калі ён увайшоў у штаб. Ён выклікаў камандзіраў рот, пазнаёміў іх з абстаноўкай. Хутка на сваім сярэднім танку прыбыў Пушкарскі.

Калона складалася з сярэдніх і лёгкіх танкаў. Забалочаная мясцовасць не дазваляла ісці фарсіраваным маршам. Да таго-ж фашысты паспелі заняць тую вёску, куды было загадана сцягваць сілы. Каб трапіць сюды трэба было абыйсці дзве вёскі і балота. Але і праціўнік не драмаў. Ён адкрыў моцны агонь і падбіў адзін сярэдні танк з калоны Палаўчэні.

У капітана ўжо дванаццацігадовы ваенны стаж. Яму добра вядомы слаўныя традыцыі Чырвонай Арміі — савецкі воін павінен не толькі няшчадна біць ворага, але і не пакідаць таварыша ў бядзе. А праціўнік падбіў яшчэ адну машыну. Абодвы танкі спыніліся непадалёку ад пярэдняга краю праціўніка. Фашысты хочуць жыўцом узяць савецкіх танкістаў. Палаўчэня ўбачыў — танкам пагражае смяротная небяспека.

— От калі-б спатрэбіліся тросы,—сказаў ён і пачухаў патыліцу, як гэта рабіў яго бацька, калі быў чым заклапочаны.

Нядоўга думаючы, ён перадаў камандаванне батальёнам аднаму з ротных камандзіраў,

а сам накіраваўся на камандны пункт камандзіра стралковага злучэння. Ці нельга дастаць чатыры тросы?

— Будзе,—сказаў камандзір.

Палаўчэня вярнуўся на поле бою. Немцы прадаўжалі насядаць. Адкрыўшы агонь, Палаўчэня на сваім танку падышоў да адной з падбітых машын і хацеў узяць на буксір. Не спыняючы агня, ён заднім ходам стаў цягнуць падбіты танк. Але вораг яшчэ мацней стаў біць з супроцьтанкавых гармат, і Палаўчэні прышлося бярнуцца.

— Добра-ж, фрыц, я цябе перахітру...

І з часткаю сярэдніх і лёгкіх танкаў ён займае абарону і чакае, калі сцямнее. Да сярэдніх танкаў ён прычапіў гарматы, а на танкі пасадзіў стралкоў-аўтаматчыкаў. Гэтай камбінаванай сілай ён утрымлівае рубеж, а ўночы пачынае дзейнічаць. Астатнім танкам ён загадаў перайсці на іншыя пазіцыі і паказаць від, што там дзейнічаюць вялікія сілы, каб вораг забыўся пра ўчастак, які займае Палаўчэня.

Праўда, праціўнік перанёс галоўны агонь у другім кірунку, але і падбітых танкаў не выпускаў з-пад свае ўвагі. Так прайшло некалькі гадзін. Раптам Палаўчэня ўбачыў, як нехта паўзком і падбежкам прабіраецца да яго танка. Гэта быў палітрук — супрацоўнік армейскай газеты, часты госць на полі бою. Але цяпер Палаўчэня ніяк не мог зразумець—чаго ён прабіраецца да танка. Калі капітан быў у камандзіра стралковага злучэння, ён там ба-

чыў палітрука. Той вельмі зацікавіўся ідэяй капітана. Палаўчэня прыадкрыў люк.

— Што, тросы ўжо гатовы?

— Не толькі гатовы, але ўжо на пазіцыі.

А для цябе, капітан, маю добрую навіну...

Але капітан ужо не слухаў. Ён выскачыў з танка.

— Бандарэнка, за мной!

— Таварыш капітан!—зваў палітрук.

А Палаўчэня, не падымаючы галавы, усё поўз і поўз наперад. Калі агонь сціхаў, ён падымаўся і падбежкам прабіраўся далей. Вось, нарэшце, і тросы. Разам з байцамі ўзвода абслугоўвання ён прымацаваў да лёгкага танка канцы тросаў, а другія канцы—да падбітых танкаў. Работа была нялёгкая: тросы прышлося цягаць па гразі, быццам пракладаць тэлефонныя правады, а праціўнік прадаўжаў абстрэл. Але работа не прыпынялася ні на хвіліну. Камандзір стралковага злучэння выкаціў супроцьтанкавую батарэю і прамой наводкай стаў біць па немцах, узяўшы пад абарону работу танкістаў.

Нарэшце, тросы замацаваны. Падбітыя танкі заварушыліся, ажылі і крануліся з месца. Немцы хацелі перашкодзіць, але супроцьтанкавая батарэя, якая ахоўвала савецкіх танкістаў, адкрыла такі агонь, што фашысты вымушаны былі замоўкнуць і глядзець, як падбітыя танкі ўсё больш і больш аддаляюцца.

## 7

Было пахмурна, як перад дажджом.

— Немцы не любяць начнога бою,—сказаў капітан. —А мы ў сябе дома, і ноч нам толькі дапаможа.

Сабраўшы ўсе свае танкі, капітан Палаўчэня пайшоў у атаку. Адзін лёгкі танк узарваўся. Немец, аказваецца, замініраваў усе подступы. Прышлося змяніць напрамак, пайсці ў абход. Гэта быў вельмі цяжкі марш. Але поспеху дапамагла ноч. Нечаканым ударам адтуль, адкуль вораг і не чакаў, танкі ўрэзаліся ў размяшчэнне праціўніка. Не даўшы ворагу апамятацца, сталёвыя крэпасці гусеніцамі сталі трушчыць і знішчаць яго тэхніку, узбраенне і жывую сілу.

У разгары бою Палаўчэня ўбачыў, што выратаваныя ім нядаўна танкі зноў вярнуліся ў строй.

Пяхота прадаўжала гнаць адступаючага ворага. Танкісты вышлі з машын. Да Палаўчэні прывялі палоннага немца. У яго знайшлі запісную кніжку, дзе было адзначана: «Камандзір танкавай брыгады капітан Палаўчэня».

Палаўчэня рассмяяўся:

— Фрыцы мяне ўжо камбрыгам зрабілі...

— У страха вочы вялікія... — заўважыў нехта.

— Справа не толькі ў гэтым,—перабіў Палаўчэня,—а ў тым, што трэба рабіць так, каб і меншыя сілы маглі збянтэжыць і разбіць ворага.

Танкісты сталі ўспамінаць асобныя эпізоды сёнешняга бою. Ніхто не заўважыў палітрука — супрацоўніка газеты. Ён хутка запісваў расказы танкістаў.

— А цяпер і я маю вам сказаць,—загаварыў ён і дастаў з палявое сумкі свежы нумар армейскай газеты і, разгарнуўшы яе, стаў чытаць:

«Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза капітану Палаўчэні Гаўрыілу Антонавічу».

Павіншавалі, пацалункі.

Першым загаварыў Пушкарскі.

— Дзякуй, таварыш палітрук... Дзякуй табе, што гэтую навіну ты прынёс нам сюды на поле бою...

— Ды яшчэ пасля ўдалага бою,—дадаў Бандарэнка.

## 8

Беларуская зямля. Побач — Пскоўская вобласць. Невялікая вёска ля Заходняй Дзвіны. Пярэдні край абароны праціўніка ўсяго толькі за чатыры, за пяць кілометраў адсюль. У гэтай вёсцы і прыпыніўся танкавы батальён маёра Палаўчэні. Сюды прыехаў Член Ваеннага Савета фронта для ўручэння ордэнаў узнагароджаным.

Вясна ўжо на зыходзе. На вуліцы вёскі сабраліся ўзнагароджаныя байцы і камандзіры, танкісты часці Палаўчэні. Зусім блізка чуваць

выбухі снарадаў. Камандзір злучэння гаворыць аб подвігах маёра Палаўчэні:

— Ён вырас у дні вайны, а свой вопыт набыў у жорсткіх баях. Цяпер маёр Палаўчэня—камандзір часці. Ён вучыць маладых танкістаў ваяваць мужна і храбра, перамагаючы ўсё на шляху да перамогі.

Палаўчэня падняўся з месца. Яго блакітныя вочы іскрыліся радасцю. Чубок віхрыўся яшчэ больш непакорна. Хвіліну ён стаяў моўчкі, потым загаварыў:

— Таварышы... Сябры мае па бітвах... Як добра пахне...— ён удыхнуў у сябе паветра,—пахне нашай беларускай вярбой і чаромхай... Як добра, што высокую пачэсную ўзнагароду я атрымаў на сваёй роднай зямлі. За гэтую зямлю я біў і буду яшчэ больш бязлітасна біць і знішчаць нашых заклятых ворагаў.

---

Рэдактар І. ГУРСКІ

Падпісана да друку 17/VII 1943 г.
$1^1/_8$ друк. аркуш. А1415.
Заказ № 1525. Тыраж 30000.

Друкарня «Известий», Масква

Цана 60 кап.